***М.А. Гурскі***
БДЭУ (Мінск)

# ЭВАЛЮЦЫЯ ОРГАНАЎ ПРАДСТАЎНІЧАЙ УЛАДЫ Ў БССР

Інстытут прадстаўнічай улады ў савецкі перыяд гісторыі Беларусі прайшоў пэўную эвалюцыю. Канстытуцыя ССРБ, прынятая 3 лютага 1919 г., абвяшчала вышэйшым органам улады З'езд Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў. У перыяд паміж з'ездам уладныя функцыі ажыццяўляў ЦВК ССРБ. Згодна з арт. 18 Канстытуцыі ССРБ, З'езд склікаўся не меньш чым 2 разы ў год. ЦВК абіраўся ў колькасці 50 чалавек і нёс адказнасць за сваю дзейнасць перад З'ездам Саветаў Беларусі.

Наступны этап развіцця беларускага савецкага парламентарызму звязаны з другой Канстытуцыяй БССР, прынятай у 1927 г. Канстытуцыя вызначала парадак склікання З'езда, замацавала яго кампетэнцыю. Усебеларускі З'езд Саветаў фарміраваўся з прадстаўнікоў гарадскіх Саветаў — з разліку адзін дэпутат на 2 тыс. выбаршчыкаў і з акруговых з'ездаў Саветаў — з разліку адзін дэпутат на 10 тыс. жыхароў. Такім чынам у выбарчым праве рэалізаваўся прынцып дыктатуры пралетарыяту, які даваў абсалютную перавагу ў органах улады рабочым. Да кампетэнцыі Усебеларускага З'езда Саветаў належылі: устанаўленне, дапаўненне і змена асноў Канстытуцыі БССР; вырашенне у адпаведнасці з Канстытуцыяй СССР пытанняў аб змене граніц БССР; агульнае кіраванне ўсёй палітыкай і народнай гаспадаркай БССР; адміністрацыйнае дзяленне тэрыторыі БССР; зацвярджэнне кодэксаў, законаў БССР у адпаведнасці з СССР і іншыя пытанні.

Істотныя змены ў парламентарскай сістэме былі звязаны з новым перыядам развіцця савецкага грамадскага, вызначанага саюзнай Канстытуцыяй 1936 г. як поўная перамога сацыялізму. Замест З'езда Саветаў вышэйшым органам дзяржаўнай улады абвяшчаўся Вярхоўны Савет БССР. Згодна з Канстытуцыяй БССР, прынятай у 1937 г., Вярхоўны Савет БССР выбіраўся грамадзянамі БССР па выбарчых акругах тэрмінам на чатыры гады па норме: 1 дэпутат на 20 тыс. насельніцтва. Вярхоўны Савет БССР з'яўляўся адзіным заканадаўчым органам БССР. Такім чынам, савецкая выбарчая сістэма адышла ад прынцыпу дыктатуры пралетарыяту, што адпавядала выснове аб ліквідацыі класавых супярэчнасцяў, якая была зроблена ў Канстытуцыі СССР 1936 г. Веданню БССР ў асобе вышэйшых органаў улады падлягалі: устанаўленне Канстытуцыі БССР і кантроль за яе выкананнем; адміністратыўнае дзяленне; заканадаўства БССР; ахова дзяржаўнага парадку і правоў грамадзян; зацвярджэнне народнагаспадарчага плана і бюджэту БССР і іншыя пытанні.

Наступная Канстытуцыя была прынята Вярхоўным Саветам 14 красавіка 1978 г. У прэамбуле было сказана, што менавіта народ прымае і

абвяшчае гэту Канстытуцыю. Вярхоўны Савет БССР складаецца з 485 дэпутатаў, якія выбіраліся па выбарчых акругах з роўнай колькасцю насельніцтва. Сесіі Вярхоўнага Савета БССР склікаліся 2 разы ў год.

Згодна з Канстытуцыяй значна ўзрасла роля прадстаўнічых органаў (Саветаў усіх звенняў) у дзяржаўным механізме і палітычнай сістэме грамадства. Толькі Саветы атрымалі права быць органамі дзяржаўнай улады. Дэмакратычныя працэсы канца 80-х гг. XX ст. патрабавалі ўнясення змяненняў у Канстытуцыю 1978 г. 27 кастрычніка 1989 г. у адпаведнасці з Законам Вярхоўнага Савета «Аб змяненнях і дапаўненнях да Канстытуцыі БССР» былі ўнесены наступныя змены: да пяці годоў павялічваўся тэрмін дзейнасці Савета Народных Дэпутатаў; двумя тэрмінамі абмяжоўвалася знаходжанне асобы на пасадзе Старшыні Вярхоўнага Савета; замацавана норма аб прадстаўніцтве ў Вярхоўным Савеце некаторых грамадскіх арганізацый і г.д.

Такім чынам, гісторыя прадстаўнічых органаў на тэрыторыі Беларусі — важная частка канстытуцыйнай гісторыі ў цэлым. Эвалюцыя савецкага беларускага парламентарызму залежала ад сацыяльна-эканамічных і палітычных змен у краіне, і яе вопыт карысны для новага этапа беларускага парламентарызму, звязанага з суверэннай Рэспублікай Беларусь.

***С.А. Гур'еў***
БДУ (Мінск)

# КРЫМІНАЛЬНЫ КОДЭКС БЕЛАРУСКАЙ ССР 1928 г. У КАНТЭКСЦЕ ПРЫНЯЦЦЯ КАНСТЫТУЦЫІ БССР 1927 г.

Другая Канстытуцыя Беларускай ССР была прынята ў 1927 г. Да гэтага часу быў утвораны СССР, прынята Канстытуцыя СССР 1924 г., якая з'явілася асновай для прыняцця рэспубліканскіх законаў. Найбольш важным наваўвядзеннем Канстытуцыі БССР 1927 г. стала вызначэнне магчымасцей законатворчай дзейнасці вышэйшых і цэнтральных органаў дзяржаўнай улады Беларусі. 23 верасня 1928 г. Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР 8-га склікання ў адпаведнасці з Канстытуцыяй БССР 1927 г. і на падставе замацаваных у ёй паўнамоцтваў на 3-й сесіі прыняў Крымінальны кодэкс (КК) БССР 1928 г., які быў уведзены ў дзеянне з 15 лістапада 1928 г.

Асноўнай задачай КК абвяшчалася судова-прававая абарона сацыялістычнай дзяржавы ад грамадска небяспечных учынкаў шляхам прымянення да праваапарушальнікаў мер сацыяльнага ўздзеяння. Злачынствам аб'яўлялася ўсякае «грамадскі небяспечнае дзеянне ці бяздзейнасць, накіраванае супраць асноў савецкага ладу ці правапарадку». Гэтае вызначэнне называла матэрыяльны прызнак злачынства — гра-



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by